

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія №2 г.Слуцка”

# Сачыненне

# “Мая Радзіма - Беларусь”


Васільева Ніка
5 “Б” клас
Настаўнік:
Зубовіч Таццяна Антонаўна

Мая Радзіма - Беларусь

Ёсць на зямлі такі куток,
З якім навек я злучаны,
Адкуль ступіў свой першы крок –
Мая радзіма – Случчына.

Васіль Вітка.

Калі я была зусім маленькая, мая бабуля мне неяк сказала: “Няма, унучка, краіны лепшай, чым Беларусь”. Тады я не звярнула ўвагі на гэтыя словы, а цяпер, будучы вучаніцай, усё больш і больш пераконваюся ў гэтым.

“Сінявокая” − так часта кажуць пра Беларусь. І гэта, сапраўды, так. Цяжка ўявіць сабе, што на тэрыторыі нашай краіны больш за дваццаць тысяч рэк, дзесяць тысяч азёр.

А якія палі з дзьмухаўцамі і рамонкамі, па якіх так прыемна прабегчыся! А колькі радасці прыносіць сустрэча з валошкай! Убачыш блакітныя зорачкі на ўзмежку поля і міжволі забываешся на стому. Над лугамі лунаюць буслы. Нездарма маю Радзіму называюць “зямлёй пад белымі крыламі”.

А як прыемна правесці час у лесе, збіраючы грыбы ці ягады, ловячы кожны птушыны спеў і прыродны гук! Лес сустрэне мяне дружалюбным пошумам, падорыць першую пралеску.

А пах рапсавых палёў! Водар скошаных траў…Бяздоннае загадкавае неба... Гэта ўсё мая Беларусь! І хто хоць раз наведаў яе, захоча вярнуцца зноў, каб пачуць мілагучную беларускую мову, у якой шмат пяшчотных, самабытных слоў! Жыць у Беларусі – гэта значыць любіць яе традыцыі, звычаі, ведаць культуру.

Я нарадзілася ў невялікім, але слаўным горадзе Слуцку. Праз мой родны горад працякае жывапісная рака Случ. Вакол горада шмат шырокіх палёў, дзе вырошчваюць збожжа, каб потым атрымаць духмяны, смачны хлеб. Асабліва мне падабаецца пара жніва, калі камбайны, быццам вялізныя караблі, плывуць роўнымі радамі, а жыта калышацца, нібы мора.

Я люблю расказваць сваім сябрам, што ў Слуцку ёсць шмат цікавых гістарычных месцаў: старэйшая школа Беларусі, фабрыка “Слуцкія паясы”, Свята-Міхайлаўскі сабор, помнік Сафіі Слуцкай, краязнаўчы музей, капліца Святой Варвары.

Мой горад мае багатую гісторыю, таму пра Слуцк нават здымаюць фільмы, напрыклад, пра набегі крымскіх татар і Анастасію Слуцкую.

Людзі ў маім любімым горадзе творчыя і цікавыя. Шмат вядомых беларусаў нарадзілася на Случчыне: астраном Вітольд Цэраскі, вучоны Сямён Косберг, паэт Васіль Вітка, вучоны Аляксандр Рубанаў, хірург Алег Румо.. Случчына ўзбагаціла Беларусь сапраўднымі брыльянтамі, якія праславілі нас ва ўсім свеце.

Каб далей наша краіна радавала жыхароў і гасцей сваімі дасягненнямі, мы, дзеці, павінны захоўваць духоўнае багацце народа і традыцыі родных мясцін, паважаць нашых продкаў, дапамагаць старэйшым і старацца добра

вучыцца. Калі мы будзем развівацца, то таксама зможам унесці карысны уклад у будучыню Беларусі.

На Случчыне ладзіцца шмат свят. Адно з іх – Купалле. Гэта свята чакае ўся моладзь. Кажуць, што той, хто знойдзе папараць-кветку, стане самым шчаслівым. Але ж не патрэбна мне гэта кветка, бо я нарадзілася ў самым прыгожым і шчаслівым куточку Зямлі! Вельмі важна любіць сваю Радзіму, бо Радзіма, як бацькі, у нас адна і ў сэрцы назаўжды.

